Кава, Wi-Fi, свежыя газеты...

11 снежня ўвойдзе ў гісторыю беларускага друку. Насупраць мінскага Палаца спорту свае дзверы гасцінна адчыніў першы «разумны» павільён «Белсаюздрука». Так, колішнія кіёскі, якія не мянялі свой знешні выгляд дзесяцігоддзямі, пакрысе замяняліся звычайнымі павільёнамі, у якіх можна было не толькі выбраць, не спяшаючыся, свежы нумар патрэбнага выдання, але і замовіць кубачак кавы. Гандлёвы аб'ект, які адкрыўся сёння, на першы погляд не такі і вялікі — усяго 24 квадратныя метры па плошчы. Але змяшчае вельмі шмат цікавінак.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ і генеральны дырэктар РУП «Белсаюздрук» Ігар ДУДЗІЧ падчас адкрыцця новага павільёна.

Цяпер падчас выбару выдання або піцца кавы можна падзарадзіць смартфон. Калі трэба выйсці ў Сеціва — да паслуг наведвальнікаў безлімітны Wi-Fi. Запрацуе і імгненная сістэма ацэнкі прадаўцоў — так званы «лайкер». Ён дазволіць аператыўна рэагаваць на заўвагі і прапановы па рабоце як прадаўца, так і гандлёвай сеткі ў цэлым.

Паклапаціліся тут і пра хуткае абслугоўванне замежных гасцей, якія не валодаюць беларускай і рускай мовамі. Ім на дапамогу прыйдзе анлайн-перакладчык. Гэта асабліва важна, калі ўлічыць, што ўжо працяглы час у Беларусі дзейнічае кароткатэрміновы бязвізавы ўезд для грамадзян многіх краін свету, а таксама тое, што наперадзе — II Еўрапейскія гульні. Дарэчы, да гэтай спартыўнай падзеі ў павільёнах запрацуюць гарадскія навігатары, якія дапамогуць замежнікам арыентавацца ў Мінску.

Функцыянал «разумнага» павільёна на гэтым не заканчваецца. І ўжо акрэслены перспектывы яго пашырэння. З яго дапамогай можна будзе замовіць таксі, выклікаць экстранныя службы. А яшчэ — аплаціць камунальныя паслугі, заказаць білет на канцэрт і выбраць падарункавы сертыфікат буйных універмагаў.

Першы пакупнік.

— Узровень магчымасцяў такога павільёна значна перавышае тыя, якія ёсць у звычайных кіёскаў, — заўважыў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Мы ўжо задумваемся над тым, каб шырэй прадставіць у такіх гандлёвых кропках перыядычныя выданні. Па-першае, тут большая гандлёвая плошча. Па-другое, тут створаны добрыя ўмовы, каб пакупнік выбіраў патрэбныя яму выданні. Адначасова тут можна прадставіць больш за 250 найменняў перыёдыкі.

Аляксандр Карлюкевіч анансаваў, што да II Еўрапейскіх гульняў у Мінску адчыняць дзверы яшчэ некалькі дзясяткаў такіх павільёнаў «Белсаюздрука». Усе пляцоўкі для іх вызначаюцца сумесна з Мінгарвыканкамам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЛЁД ХРУСЦІЦЬ ПАДМАНЛІВА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Адзін з братоў праваліўся непадалёк ад берага, здолеў выкараскацца сам і пабег дадому клікаць на дапамогу бацьку, дом стаяў зусім непадалёк ад ракі, — гаворыць **вядучы спецыяліст рэспубліканскага Савета Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Бацька палез ратаваць сына, і ледзь не патануў сам. Цячэнне ракі там даволі моцнае і яно панесла падлетка ад таго месца, дзе ён праваліўся.

Вадалазы шукалі яго цела амаль тыдзень. Справа ў тым, што з-за пераменлівага надвор'я ў вадзе ўтварыўся густы шарош — нетрывалыя кавалкі лёду. І вадалазам даводзілася разграбаць гэта ўсё ўручную ва ўмовах амаль нулявой бачнасці.

Яшчэ дзве трагедыі звязаны з рыбакамі. Па першым лёдзе рыба клюе, як вядома, вельмі добра. Непадалёк ад вёскі Мохаў Лоеўскага раёна мужчына паставіў сетку. А калі паплыў яе правяраць на лодцы, то перакуліўся і патануў. Яшчэ адзін рыбак праваліўся пад лёд у Мсціслаўскім раёне — на жаль, выбрацца назад ён таксама не паспеў.

А ў Жлобінскім раёне ў мінулую нядзелю ў меліярацыйны канал на хуткасці вылецеў легкавік. Ён перавярнуўся ў паветры і сваім дахам праламаў лёд. Калі ратавальнікі дасталі машыну з вады, то знайшлі ў ёй два целы — 37-гадовага кіроўцы і яго 59-гадовай маці.

— У першыя дні снежня на стаячых вадаёмах таўшчыня лёду дасягала 10 сантыметраў, — гаворыць Алег Баразна. — Як быццам бы і бяспечна — кропкай адліку лічыцца паказчык у сем сантыметраў, праўда, ён справядлівы тады, калі на лёд выходзіць адзін чалавек. Калі ж людзей некалькі, то лёд мусіць нарасці да 12 сантыметраў. Разам з тым маразам папярэднічала вельмі пераменлівае надвор'е. Адмоўныя тэмпературы ўначы змяняліся дадатнымі ўдзень. Лядок, які ледзь-ледзь сфарміраваўся, пачынае раставаць. Вады падбаўляюць дожджыкі і мокры снег. Наступнай ноччу яго зноў накрывае невялікім марозам. І вось так замест суцэльнай структуры покрыва ўтвараецца порыстая. Візуальна здаецца, што лёд набраў істотную таўшчыню. Хоць рэальны слой яго там складае ад сілы пару-тройку сантыметраў, якія, вядома, чалавека не ўтрымаюць. Менавіта таму выканкамы адзін за адным выдавалі напрыканцы лістапада забароны выхаду на лёд.

За які час фарміруецца бяспечнае покрыва?

— Гэта залежыць ад спецыфікі вадаёма. Ідэальныя ўмовы — стаячае возера, дзе адсутнічае цячэнне, няма ніякіх падземных крыніц і скідаў адпрацаванай цёплай вады. Кожны з пералічаных фактараў толькі запавольвае фарміраванне трывалага лёду. Ды і тое, трэба, каб на працягу як мінімум тыдня і начная, і дзённая тэмпературы былі ўвесь час адмоўнымі. Вось тады і сфарміруецца трывалы лёд. Ён мае белы або крыху блакітны колер. Уся астатняя гама — шэры, бледны, брудны — кажа пра тое, што покрыва разбураецца і вельмі небяспечнае.

Раней мы рэгістравалі шмат выпадкаў, як людзі правальваліся пад лёд, калі зразалі дарогу па замёрзлым вадаёме, каб не наразаць кіламетры да найбліжэйшага моста. Асабліва гэта датычылася сельскай мясцовасці. Апошнім часам гэтая праблема стаіць ужо не так востра.

Што рабіць, калі чалавек праваліўся пад лёд?

— Тэмпература падлёднай вады складае прыкладна 3—5 градусаў вышэй за нуль. У залежнасці ад масы цела і фізічнай падрыхтаванасці ў небаракі ёсць не больш за пяць хвілін да таго моманту, калі ён проста не здолее рухацца. Мышцы здранцвеюць, чалавек атрымае агульнае пераахалоджанне — і пойдзе ўніз. Дзіця, якое важыць менш за дарослага, замерзне куды хутчэй.

Менавіта таму перад выхадам на лёд трэба надзець ратавальную камізэльку. Нават калі вы праваліцеся пад лёд, то яна будзе падтрымліваць вас на паверхні вады, каб выбрацца. Таксама вельмі пажадана мець пры сабе спецыяльныя лядовыя штыры. Іх нават можна не шукаць у краме, а змайстраваць самому — увагнаць цвік у доўгую драўляную ручку. З дапамогай гэтага імправізаванага альпенштока можна падцягнуцца на паверхню лёду з палонкі. Таксама нядрэнна мець пры сабе лінь. Таму трэба выходзіць на лёд мінімум удваіх.

З чалавекам, які праваліўся, нельга ўваходзіць у прамы кантакт. Той, хто знаходзіцца ў палонцы, будзе чапляцца за любую магчымасць выратавацца дзякуючы інстынкту самазахавання. І з высокай доляй верагоднасці пацягне ратавальніка ўслед за сабой у палонку. Таму трэба працягнуць яму доўгі кій, вяроўку, падыдзе нават верхняя вопратка, скручаная ў жгут. Набліжацца да палонкі трэба толькі паўзком — калі чалавек праваліўся, значыць, лёд там крохкі і трэба змяншаць на яго ціск. Не саромцеся клікаць на дапамогу іншых людзей. Пасля таго як выцягнулі чалавека з вады — выклічце хуткую дапамогу і паспрабуйце яго сагрэць.

Фота БелТА.

Некалькі гадоў таму Таварыства ратавання на водах падрыхтавала законапраект. Ён прадугледжваў магчымасць штрафу за выхад на неакрэплы лёд. Але...

— Як мы ні спрабавалі даказаць, што гэта скіравана не на тое, каб пакараць, а каб папярэдзіць, — пакуль што закон так і застаецца ў выглядзе праекта, — гаворыць Алег Баразна. — Будзем спадзявацца, што гэтая справа ўсё-такі зрушыцца з мёртвага пункту...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

На слыху

ЧАМУ АБВАЛІЛАСЯ СТОЛЬ У «АРЭНА-СІЦІ»

У сталіцы ўжо праверана больш за палову аналагічных аб'ектаў

Адной з найбольш верагодных прычын абрушэння гіпсакардоннай падвеснай столі ў сталічным гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-Сіці» з'яўляецца парушэнне парадку правядзення будаўніча-мантажных работ. Пра гэта ў эфіры тэлеканала СТБ паведаміў намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Андрэй БЕРТАШ.

«Адна з папярэдніх версій — парушэнне будаўніча-мантажных работ пры ўкладцы гэтай столі. Гэта адна з самых відавочных прычын», — сказаў прадстаўнік МНС у праграме «Вялікі горад».

Дакладную прычыну ўстанаўлівае Следчы камітэт, праводзіцца шэраг экспертыз. «Такіх выпадкаў у нас сапраўды за практыку не было, — адзначыў Андрэй Берташ. — Пасля таго як адбылося гэтае абрушэнне, дадзена даручэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях праверыць усе аб'екты. А ў Мінску іх з такімі ж столямі — 191, і ўжо больш за палову праверана».

Праверкі працягваюцца, іх скончаць праз два тыдні. «І пра гэта будзе паведамлена. Разгледзім усе гэтыя пытанні, якія выяўляюцца. Дадзены тэрміны на ліквідацыю, каб не паўтарыць падобнага», — адзначыў намеснік начальніка гарадскога ўпраўлення МНС.

Нагадаем, 12 лістапада ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-Сіці» абрынулася падвесная столь на плошчы 150 квадратных метраў. У выніку інцыдэнту пацярпелі дзве дзяўчыны. Пасля гэтага камісія па надзвычайных сітуацыях прыняла рашэнне праверыць усе аналагічныя столевыя канструкцыі ў гандлёвых аб'ектах Мінска.

Работы ж па аднаўленні канструкцый столі ў «Арэна-Сіці» плануюць завяршыць да 25 снежня, і гандлёвы цэнтр будзе цалкам даступны для наведвальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБВІНАВАЧАННЕ НЕ ПРАД'ЯЎЛЯЛАСЯ...

Завершана расследаванне крымінальнай справы аб забойстве і замаху на забойства.

Як паведамлялася раней, 17 жніўня ў вёсцы Бабровічы Івацэвіцкага раёна мясцовы жыхар 1961 года нараджэння адкрыў стральбу з агнястрэльнай зброі па ўчастковых інспектарах міліцыі, якія праводзілі планавую праверку парадку захоўвання зброі. У выніку адзін з супрацоўнікаў быў смяротна паранены. Яго калегу былі прычыненыя цялесныя пашкоджанні, якія адносяцца да катэгорыі цяжкіх. Мужчына, які адкрыў агонь па ўчастковых, з 1987 года быў зарэгістраваны паляўнічым, меў дзеючы дазвол на захоўванне і нашэнне агнястрэльнай зброі.

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці, праведзенай комплекснай судовай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызай было ўстаноўлена, што абвінавачваны хварэў у момант здзяйснення інкрымінуемых яму дзеянняў і хварэе зараз на псіхічнае расстройства. У гэтай сувязі канчатковае абвінавачанне мужчыну не прад'яўлялася.

У перыяд расследавання крымінальнай справы ў сродках масавай інфармацыі мусіраваліся чуткі з нагоды быццам бы браканьерства міліцыянера. Гэтая інфармацыя была старанна праверана, аднак свайго аб'ектыўнага пацвярджэння не знайшла.

Крымінальная справа перададзена пракурору для накіравання ў суд, які разгледзіць пытанне аб прымяненні да абвінавачванага прымусовых мер бяспекі і лячэння.

Сяргей КУЛАКОЎ.